# I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

**X клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

*Кастрычнік 2024 г., Гродна*

## ДАВЕДКІ

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 4 | 5 | 6 | 5 | 4 | 5 | 5 | 6 | 5 | 5 | 50 |

**Заданне 1.** *Максімальная колькасць балаў – 4; 0,25 за правільна абазначаны гук у слове*

| | | | |
|---|---|---|---|
| па**д**чарка | **[ ч ]** | збярус**я і** паеду | **[ й ]** |
| **с**хіліцца | **[ с ]** | па-сусе**дс**ку | **[ ц ]** |
| **з** мяне | **[ з’ ]** | аб’е**зджаны** | **[ ж ]** |
| аб’е**зд**чык | **[ ш ]** | **не** ведаю | **[ а ]** |
| **з** кім-небудзь | **[ с ]** | ра**зж**ыцца | **[ ж ]** |
| выхваляе**шся** | **[ с’ ]** | Іван **і** Васіль | **[ ы ]** |
| на палі**ч**цы | **[ ц ]** | ва**к**зал | **[ г ] выбухны** |
| хрэ**сь**біны | **[ з’ ]** | **с**меласць | **[ с’ ]** |

**Заданне 2.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 1 бал за выпраўленую памылку*

| Сказы з памылкай | Нарматыўнае напісанне |
|---|---|
| 1. Уваход у залу толькі па прапусках. | ***пропусках*** |
| 2. Падчас гульні ў карты на руках у Антося засталася пікавая дама. | ***піковая*** |
| 3. У летніку было пяціразавае харчаванне. | ***пяціразовае*** |

| | |
|---|---|
| 4. У цеста маці любіла дабаўляць сываратку. | ***сыроватку*** |
| 5. Кірыл лавіў на вуду тоўсталобікаў. | ***таўсталобікаў*** |

**Заданне 3.** *Максімальная колькасць балаў – 6; 0,5 за кожную пару*

Адказ: 1г, 2і, 3д, 4е, 5л, 6ж, 7а, 8з, 9м, 10б, 11к, 12в
неба – пяты акіян;
жаўранак – срэбны званочак;
лес – зялёнае мора;
бабёр – балотны цясляр;
зоркі – нябесныя вочы;
каханне – радасць жыцця;
вайна – крывавая завіруха;
бульба – другі хлеб;
маладосць – жыццёвы ранак;
лён – беларускі шоўк;
радзіма – прадзедаў зямля;
зязюля – лясная варажбітка.

**Заданне 4.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 0,25 за кожнае правільна вызначанае слова*

назоўнік – двойка, падваенне, двойня, двоечнік, двайнік;
прыметнік – дваякі, двайны;
дзеяслоў – падвоіць;
дзеепрыметнік (форма дзеяслова) – падвоены;
дзеепрыслоўе (форма дзеялова) – падвоіўшы;
лічэбнік – абодва, дзве, другі, двое, двухтысячны, дзвесце;
прыслоўе – удвая, удвух, двойчы, па-другое.

**Заданне 5.** *Максімальная колькасць балаў – 4; 0,25 за кожны займеннік, 0,25 за правільна вызначаны разрад*

а) зарубіць ***сабе*** на носе ***(зваротны)***
б) на ***свой*** капыл (перарабіць) ***(прыналежны)***
в) на ***ўсе*** лады ***(азначальны)***
г) не з ***тваімі*** рукамі ***(прыналежны)***
д) паспытаць ***свайго*** хлеба ***(прыналежны)***
е) чуць на ***свае*** вушы ***(прыналежны)***
ж) як на ***тое*** ліха ***(указальны)***
з) скінуць з ***сябе*** ветхага Адама ***(зваротны)***

**Заданне 6.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 0,5 за кожнае слова*

| | | | |
|---|---|---|---|
| скрывіўся (па) пакутніцку | ***3*** | (усё) роўна не прыйдзе | ***2*** |
| чытаць (на) хаду | ***2*** | усе мелі (па) роўну ўсяго | ***1*** |
| стаяць (на) смерць | ***1*** | гэтак (сама) паводзіць сябе | ***1*** |
| бралася (на) відно | ***2*** | (што) колечы падрыхтаваць | ***3*** |
| глядзець (па) доўгу на дарогу | ***1*** | пісаць (па) латыні | ***3*** |

**Заданне 7.** *Максімальная колькасць балаў – 5*

| | |
|---|---|
| 1. заграніца | А. Асноваскладанне |
| 2. лодачнік | Б. Бяссуфіксны |
| 3. падспудны | В. Прыставачна-суфіксальны |
| 4. інтэлектуал | Г. Прыставачны |
| 5. суднабудаванне | Д. Словаскладанне |
| | Е. Суфіксальны |

**Адказ:** 1 Г, 2 Е, 3 В, 4 Б, 5 А

**Заданне 8.** *Максімальная колькасць балаў – 6; 1 бал за кожны сказ*

1. Малы хлапчук**,** унучак дзедаў**,** сядзеў на возе. ***(адасобленым прыдаткам)***
2. Лёд**,** бы камень самацветны**,** блішчыць праменнаю ігрой. ***(параўнальным зваротам)***
3. Давайце**,** добрыя сябры**,** пагутарым аб шчасці. ***(зваротам)***
4. Людзі **(**а іх было багата**)** проста за жываты хапаліся ад смеху. ***(устаўным сказам)***
5. Васіль Талаш**,** ва ўзросце 75 гадоў арганізаваўшы і ўзначаліўшы партызанскі атрад**,** змагаўся на Палессі супраць польскіх войскаў у 1919 – 1920 гг. ***(аднароднымі адасобленымі акалічнасцямі)***
6. Скажы**,** калі ласка**,** куды ты будзеш паступаць вучыцца? ***(пабочным словазлучэннем)***

**Заданне 9.** *Максімальная колькасць балаў – 5*

Бачу гэты ёмісты том,
Дзе на ўступных старонках
Славянская вязь
**Скарынаўскіх** першадрукаў,
Уквечная адмысловымі гравюрамі,
З усемагчымымі завіткамі-кудзеркамі

Нашай старажытнай кірыліцы.
Далей ідуць друкаваныя спехам
Шрыфты **Сымона Буднага**
І **Васіля Цяпінскага**.

І вось ужо, аўтарствам кмечаныя,
Творы **Дуніна-Марцінкевіча**,
**Багушэвіча** абарончыя вершы,
Гнеўныя вершы-адозвы Цёткі,
Бунтарныя паэмы і вершы **Купалы**,
Яго драматургічныя творы.
Усеахопныя творы **Коласа**,
Шчымліва-самотныя радкі **Багдановіча**,
На вайне беззваротна страчаных,
А дальш – ацалелых у ліхалецце –
**Быкава, Шамякіна,** Мележа…
І далей, і далей –
За старонкай старонка…
Толькі ўсемагутнымі рукамі
Народа майго
Можна том гэты ёмісты
Узняць над зямлёй
І разгарнуць,
Каб тыя, што яго стварылі
І ўжо сёння ля зорак,
Змаглі прачытаць
У 500-гадовым аб'ёме
Нашу кнігу жыцця.

**Заданне 10.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 05 б. за кожную пазіцыю*
1. Рыгор Барадулін, "Трэба дома бываць часцей"
2. Максім Багдановіч, "Маёвая песня"
3. Пятрусь Броўка, "Калі ласка!"
4. Анатоль Вярцінскі, "Два полі"
5. Кандрат Крапіва, "Мода"